***Сям'я – гэта адзінае цэлае. Добра, калі ў сям'і складваюцца сяброўскія, даверлівыя адносіны, калі ў вольны час можна заняцца ўсім разам карыснай, цікавай справай: намаляваць малюнак, адправіцца на экскурсію, схадзіць у лес па грыбы і па ягады. Для Грэцкага Мікіты і яго таты, а таксама Яўтушык Елізаветы і яе дзядулі любімы занятак – пісаць вершы.***

## *Беларусь*

*Беларусь – край мілы, родны,*
*Нівы, рэчкі і лясы,*
*Нада мной – блакіт прасторны,*
*Свет, цяпло – у маёй душы,*
*Шэпат дрэў, савы гуканне,*
*Шум бярозовых гаёў,*
*Заранкі ранняе вітанне,*
*Песні рэк і ручаёў.*

***Грэцкі Мікіта, 1 «В» клас, і Грэцкі А.Ф.***



## *Сучасніку*

*Для чаго мы жывем на зямлі?*
*Каб заўсёды быў мір на планеце,*
*Каб шчаслівымі людзі былі*
*І не зведалі войнаў больш дзеці.*

*Каб свяціла аднолькава ўсім*
*Сонца: чорным і жоўтым, і белым –*
*І ў агні нагасак, хірасім*
*Больш ніколі жыццё не гарэла.*

*Не магу зразумець толькі тых,*
*Хто сумлення людскога не мае,*
*Сёння хто на святое святых*
*Свае рукі ў крыві падымае.*

*Каб не кануць у тлен небыцця,*
*Важна ўсім помніць ісціну гэту:*
*Не для войнаў ліхіх – для жыцця*
*Захаваць трэба нашу планету.*

*Хіба мала праблем на зямлі,*
*Дзе прыкласці ўсе сілы нам трэба,*
*Каб і мы, і нашчадкі маглі*
*Бачыць сонца і яснае неба?*

*Калі ж нам яе крэмзаць, дзяліць,*
*Наступіць можа час той, здаецца, –*
*Для таго, каб далей на ёй жыць,*
*Чалавеку не будзе ўжо месца.*

***Яўтушык Елізавета, 3 «А» клас, і Курловіч В.І.***